# Вучэбна-метадычнае забеспячэнне вывучэння студэнтамі дысцыпліны «Бібліятэчны фонд»: структурна-змястоўны аспект

**Т. С. Юхнавец,**
старшы выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

*Трактоўка якасці адукацыі ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (2011) як «адпаведнасці адукацыі патрабаванням адукацыйнага стандарту, вучэбна-праграмнай дакументацыі, якая адпавядае адукацыйнай праграме» [5, с. 3] падымае праблему вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыі і яго адпаведнасці асноўнаму нарматыўнаму дакументу – адукацыйнаму стандарту. Адсутнасць такой адпаведнасці будзе негатыўна ўплываць на якасць адукацыі.*

Увогуле пытанне аб забеспячэнні вучэбна-метадычнай інфармацыяй будучых спецыялістаў у цяперашні час становіцца ўмовай іх адпаведнасці перспектывам грамадскага развіцця. Таму ў комплекс актуальных задач для прафесарска-выкладчыцкага складу вышэйшай навучальнай установы ўваходзяць дзве задачы. Першая – своечасовае выяўленне і прадстаўленне студэнтам інфармацыі аб вучэбных і вучэбна-метадычных дакументах або саміх дакументаў, якія створаны па-за межамі ВНУ і характарызуюцца прыкметамі навізны, фундаментальнасці, адпаведнасці вучэбным праграмам дысцыплін. Другая – распрацоўка і прадстаўленне студэнтам вучэбных і вучэбна-метадычных дакументаў па дысцыплінах, якія выкладаюцца ў ВНУ.

Дысцыпліна *«Бібліятэчны фонд»* з'яўляецца адной з ключавых у падрыхтоўцы студэнтаў па спецыяльнасці *«Бібліятэказнаўства і бібліяграфія»* ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Мэта вывучэння дысцыпліны – даць цэласнае ўяўленне аб сутнасці фарміравання бібліятэчнага фонду ва ўмовах інтэнсіўнага развіцця і выкарыстання новых інфармацыйных тэхналогій.

У апошнія гады праблема вучэбна-метадычнага забеспячэння дысцыплін бібліятэказнаўчага цыклу ў сувязі з пераходам на нацыянальныя адукацыйныя стандарты новага тыпу і ўкараненнем новых педагагічных тэхналогій актыўна абмяркоўваецца на навуковых і навукова-метадычных канферэнцыях і семінарах прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а таксама на міжвузаўскіх навуковых канферэнцыях рэспублікі. Тым не меней пытанню вучэбна-метадычнага забеспячэння дысцыпліны *«Бібліятэчны фонд»* надаецца недастаткова ўвагі, і яно разглядаецца разам з іншымі адукацыйнымі праблемамі, альбо асобныя яго складаючыя раскрываюцца ў кантэксце больш агульных праблем. У якасці прыкладу можна прывесці два артыкула: *«Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій пры падрыхтоўцы кадраў для бібліятэк (на прыкладзе выкладання курсаў "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды")»* [1] і *«Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў па курсу "Бібліятэчны фонд"»* [10]. Акрамя таго, вынікі вывучэння адзначанай праблемы не заўсёды знаходзяць адлюстраванне ў прафесійнай літаратуры. Таму, на жаль, пакуль што не выпрацаваны дакладныя і адзіныя патрабаванні да стварэння комплекснага вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння дысцыпліны *«Бібліятэчны фонд»*, яго ўнутранай структуры і зместу.

У дадзеным артыкуле намі будуць удакладнены вызначэнне, структура і змест вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння дысцыпліны *«Бібліятэчны фонд»* з улікам патрабаванняў адукацыйнага стандарту *«Вышэйшая адукацыя. Першая ступень»* па спецыяльнасці 1-23 01 11 *«Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)»* [2] з мэтай стварэння перадумоў для эфектыўнага фарміравання ў студэнтаў фондазнаўчых кампетэнцый.

У цяперашні час у навукова-педагагічнай літаратуры назіраюцца вялікія разыходжанні ў разглядзе праблемы складу і зместу вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу.

Так, Т. Д. Рэчкіна ў сістэме вучэбна-метадычнага забеспячэння самастойнай дзейнасці студэнта вылучае тры ўзаемазвязаныя кампаненты: 1) змястоўна-мэтавы; 2) тэхналагічны; 3) кантрольна-рэфлексіўны [9]. А. Р. Марозава сцвярджае, што *«вучэбна-метадычнае забеспячэнне ўяўляе сабой сістэму вучэбна-праграмнай дакументацыі і вучэбна-метадычных сродкаў, дыягнастычных методык і вучэбных матэрыялаў для арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, самастойнай работы навучэнцаў і інтэнсіфікацыі дзейнасці настаўніка. Асноўнымі кампанентамі вучэбна-метадычнага забеспячэння могуць быць: падручнікі і рабочыя сшыткі, метадычныя і вучэбныя дапаможнікі,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*метадычныя рэкамендацыі па вывучэнні вучэбнага прадмета, методыкі кантролю вучэбнай дзейнасці школьнікаў, методыкі арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў, даведнікі, апорныя канспекты, электронныя носьбіты вучэбнай інфармацыі»* [7, с. 10]. Ф. М. Кадырава ў якасці структурных кампанентаў вучэбна-метадычнага забеспячэння моўнай падрыхтоўкі выкладчыкаў вылучае *«анатаваную вучэбна-тэматычную праграму, інтэгратыўны трохмоўны паняційна-тэрміналагічны слоўнік, метадычны дапаможнік, які ўключае тэарэтычны матэрыял (тэксты, дыялогі, крыжаванкі), поліварыятыўныя многаўзроўневыя заданні, інструкцыі для эксперыментальнай (пад кіраўніцтвам выкладчыка) і самастойнай работы студэнтаў, набор дыягнастычных методык»* [4, с. 48].

Структура вучэбна-метадычнага забеспячэння, прапанаваная Я. А. Карчагіным, І. А. Халіулінай і С. Г. Шуралёвым, уключае тры кампаненты: нарматыўная і вучэбна-метадычная дакументацыя, сродкі навучання, сродкі кантролю [6].

Аналіз шэрагу падыходаў да вызначэння кампанентнай структуры вучэбна-метадычнага забеспячэння навучання і выхавання студэнтаў выявіў, што часцей за ўсё вучэбна-метадычнае забеспячэнне разглядаецца ў межах пэўных галін або напрамкаў адукацыі. Больш таго, у сістэму вучэбна-метадычнага забеспячэння аўтары часта ўключаюць вучэбныя праграмы і адзін з асноўных нарматыўных дакументаў – адукацыйны стандарт, якія з'яўляюцца састаўной часткай вучэбна-нарматыўнага забеспячэння працэсу навучання і выхавання. Калі выключыць гэтыя кампаненты, то, на наш погляд, застануцца асноўныя кампаненты вучэбна-метадычнага забеспячэння: метадычныя рэкамендацыі па вывучэнні курса і правядзенні заняткаў, методыкі кантролю арганізацыі і вынікаў навучання, методыкі правядзення курсавога і дыпломнага праектавання, метадычныя дапаможнікі, методыкі арганізацыі самастойнай працы студэнтаў, методыкі арганізацыі і правядзення лабараторных работ; слоўнікі, даведнікі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, канспекты, камп'ютарнае праграмнае забеспячэнне і іншыя дыдактычныя сродкі навучання.

Аналіз мэтаў і зместу выяўленых структурных кампанентаў дазваляе зрабіць выснову аб тым, што вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу – гэта сістэма, накіраваная на аказанне метадычнай дапамогі студэнтам і выкладчыкам у вучэбнай і дыдактычнай дзейнасці па пэўных адукацыйных напрамках.

Сярод усяго спектру кампанентаў вучэбна-метадычнага забеспячэння для яго ўпарадкаванага структуравання неабходна адабраць тыя, што дапамогуць усебакова і цэласна раскрыць змест значных элементаў (тэм) спецыяльнай дысцыпліны *«Бібліятэчны фонд»* і забяспечыць эфектыўнае фарміраванне адпаведных кампетэнцый студэнтаў.

Згодна з адукацыйным стандартам *«Вышэйшая адукацыя. Першая ступень»* па спецыяльнасці 23 01 11 *«Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)»* студэнт у выніку вывучэння дадзенай дысцыпліны павінен ведаць: 1) месца і сувязі падсістэмы *«бібліятэчны фонд»* у агульнай сістэме *«бібліятэка»*; 2) інтэграцыйныя працэсы ў фарміраванні бібліятэчнага фонду; 3) відавы і галіновы склад, арганізацыйную структуру сукупнага бібліятэчнага фонду краіны; 4) тэхналогію фарміравання бібліятэчнага фонду. У выніку засваення атрыманых ведаў студэнт павінен умець: выконваць працэсы і аперацыі фарміравання бібліятэчнага фонду; выкарыстоўваць метады, крыніцы і спосабы камплектавання бібліятэчнага фонду, метады і сродкі яго вывучэння і выкарыстання; ажыццяўляць тэхналагічныя працэсы фарміравання бібліятэчнага фонду ў традыцыйным і аўтаматызаваным рэжымах [2].

На выкананне адзначаных патрабаванняў накіравана вывучэнне асобных тэм, якія зафіксаваны ў тыпавой вучэбнай праграме *«Інфармацыйныя рэсурсы. Раздзел 1. Бібліятэчны фонд»* [3], і, адпаведна, іх можна аднесці да катэгорыі значных:

1. Паняцце *«бібліятэчны фонд»* і эвалюцыя ўяўленняў аб ім у бібліятэказнаўстве.
2. Бібліятэчны фонд як сістэма.
3. Бібліятэчны фонд у сістэме дакументных рэсурсаў краіны.
4. Узаемадзеянне бібліятэчных фондаў.
5. Фарміраванне бібліятэчнага фонду: паняцце, значэнне, мэта, змест.
6. Тэорыя адбору дакументаў у фонд.
7. Фарміраванне бібліятэчнага фонду як тэхналагічны цыкл.
8. Мадэліраванне бібліятэчнага фонду.
9. Камплектаванне бібліятэчнага фонду.
10. Крыніцы і спосабы камплектавання бібліятэчнага фонду.
11. Улік і апрацоўка бібліятэчнага фонду.
12. Размяшчэнне і расстаноўка бібліятэчнага фонду.
13. Захаванне і захаванасць бібліятэчнага фонду.
14. Структура кіравання фарміраваннем бібліятэчнага фонду.
15. Інфармацыйнае забеспячэнне кіравання фарміраваннем бібліятэчнага фонду.
16. Функцыі кіравання фарміраваннем бібліятэчнага фонду.

Сярод сродкаў навучання вядучая роля належыць вучэбным і вучэбна-метадычным дакументам.

*Па-першае,* гэта падручнікі, якія раскрываюць асноўны навуковы змест і практычныя аспекты дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Меркаванне некаторых спецыялістаў аб тым, што падручнік у сучасных умовах не можа быць асноўным кампанентам вучэбна-метадычнага забеспячэння, не вытрымлівае праверкі часам, бо спраектаваны як педагагічная сістэма падручнік будзе заставацца яго ключавым элементам. Неабходна толькі забяспечыць рэгулярнае абнаўленне падручнікаў і дадаткаў да іх, якія даюць магчымасць фарміраваць у студэнтаў базавыя кампетэнцыі.**

Вучэбна-метадычныя дапаможнікі дапамагаюць студэнтам сістэматызаваць свае веды, вылучаць галоўнае, вучыцца вырашаць практычныя задачы. Пры падрыхтоўцы да тэарэтычных калоквіумаў студэнты маюць прыкладны пералік кантрольных пытанняў, на якія неабходна падрыхтаваць адказы, карыстаючыся дапаможнікамі і рэкамендаванымі падручнікамі.

Аналіз патоку вучэбных і вучэбна-метадычных дакументаў у галіне бібліятэказнаўства за апошнія дзесяць гадоў выявіў цэлае кола вучэбна-метадычных і навукова-практычных дапаможнікаў па дысцыпліне *«Бібліятэчны фонд»*. Цэнтральнае звяно тут займаюць дапаможнікі, якія адпавядаюць значным элементам дысцыпліны: *«Абарона бібліятэчнага фонду»* (Ю. М. Сталяроў, М., 2006 г.); *«Бібліятэка ў экстрэмальнай сітуацыі»* (Ю. М. Сталяроў, М., 2007 г.); *«Улік дакументнага фонду бібліятэкі»* (Н. П. Сабаленка, М., 2010 г.); *«Бібліятэчны фонд»* (Т. А. Пятрова, М., 2007 г.); *«Дакументазабеспячэнне бібліятэчных фондаў»* (А. А. Салянік, М., 2007 г.); *«Дакументныя фонды бібліятэк і інфармацыйных служб»* (В. М. Морава, СПб., 2010 г.); *«Камплектаванне бібліятэчнага фонду»* (В. М. Морава, СПб., 2012 г.); *«Арганізацыя бібліятэчнага фонду»* (В. М. Морава, СПб., 2012 г.); *«Электронны дакумент у бібліятэцы»* (Т. В. Майстровіч, М., 2007 г.).

У той жа час асобных падручнікаў па дысцыпліне за адзначаны перыяд не было выяўлена. Гэта сведчыць у першую чаргу аб тым, што на сучасным этапе некаторыя фондазнаўчыя пытанні, звязаныя з новымі інфармацыйнымі і камунікацыйнымі тэхналогіямі, яшчэ не знайшлі свайго канчатковага як тэарэтычнага, так і практычнага рашэння. Тым не меней у цэлым выяўленыя вучэбныя дакументы дазваляюць студэнтам атрымаць веды і ўменні па дысцыпліне *«Бібліятэчны фонд»* згодна з адукацыйным стандартам.

*Па-другое,* метадычныя рэкамендацыі, якія характарызуюць спосабы арганізацыі вучэбнай і пазнаваўчай дзейнасці студэнтаў, рэгламентуюць метадычныя прыёмы, формы і метады арганізацыі вучэбнай і вучэбна-даследчай работы. Метадычнымі рэкамендацыямі суправаджаецца правядзенне калоквіумаў, семінарскіх, практычных, лабараторных, самастойных работ. У іх прыводзяцца методыкі выканання работ, формы справаздач, кантрольныя пытанні і спіс рэкамендаванай літаратуры да кожнай работы. Прычым яны павінны быць накіраваны на павышэнне эфектыўнасці методыкі фарміравання фондазнаўчых кампетэнцый.

*Па-трэцяе,* гэта канспекты лекцый, якія адлюстроўваюць асноўны змест вучэбнага матэрыялу. Выкарыстоўваюцца дзве формы канспектаў. Першая форма ўяўляе сабой вучэбны матэрыял, зафіксаваны студэнтам у ходзе аўдыторных заняткаў на аснове выкладання дысцыпліны выкладчыкам. Другая форма – гэта інфармацыйныя тэксты, падрыхтаваныя выкладчыкам на электронных носьбітах, дзе ў сціслым выглядзе выкладзены асноўныя паняцці тэм, а таксама прадстаўлены схемы і табліцы, якія адлюстроўваюць структурна-лагічныя сувязі дыдактычных адзінак. Электронныя канспекты выкарыстоўваюцца на этапе замацавання і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу, змяшчаюць спіс літаратуры, а таксама дазваляюць прайсці тэст па кожнай тэме.

Гаворачы аб лабараторным абсталяванні, варта перш за ўсё адзначыць, што ўвесь працэс вывучэння спецыяльнай дысцыпліны *«Бібліятэчны фонд»* цесна звязаны з выкарыстаннем персанальнага камп'ютара: прадстаўлены доступ да канспектаў лекцый у электроным выглядзе; лабараторныя работы выконваюцца непасрэдна на персанальных камп'ютарах; практыкуецца прамежкавае і выніковае камп'ютарнае тэсціраванне; выкарыстоўваюцца пакеты аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (ІРБІС, MARC-SQL, ALIS-WEB).

Выкарыстанне камп'ютарных тэхналогій патрабуе стварэння ўмоў для глыбокага авалодання студэнтамі інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі як у вучэбным працэсе, так і ў ходзе пазааўдыторных заняткаў.

Найбольш складаным і ў меншай ступені распрацаваным кампанентам вучэбна-метадычнага забеспячэння з'яўляецца блок кантрольна-вымяральных матэрыялаў на базе інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій. Блок кантрольна-вымяральных матэрыялаў дазваляе забяспечыць якаснае і эфектыўнае суправаджэнне вучэбнага працэсу, ён прадстаўляе сабой сукупнасць навучальных, дыягнастычных, кантралюючых, ацэнкавых, стымулюючых, развіваючых і іншых матэрыялаў, якія павінны ўсталёўваць узровень сфарміраванасці той ці іншай кампетэнцыі на пэўнай траекторыі навучання. Цэнтральнае месца тут займаюць камп'ютарныя праграмы для тэсціравання. З мноства пераваг тэставых тэхналогій

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дастаткова ўказаць толькі некаторыя, каб узмацніць іх неабходнасць для педагагічнай практыкі. Да такіх пераваг можна аднесці аб'ектыўнасць ацэнкі, ахоп усіх раздзелаў праграмы, адзінства патрабаванняў да ўсіх навучэнцаў, магчымасць ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці на ўсіх этапах навучання, магчымасць спалучэння з традыцыйнымі формамі кантролю (экзамен, залік, субяседаванне, апытанне і інш.). Для стварэння сістэмы тэсціравання можна выкарыстоўваць розныя праграмныя сродкі, якія дазваляюць падчас правядзення тэсціравання змяняць меру складанасці тэставых заданняў, гэта значыць ажыццяўляць механізм адаптацыі. База тэставых заданняў павінна даваць магчымасць правядзення бягучага, прамежкавага і выніковага кантролю ўзроўню засваення студэнтамі вучэбнага матэрыялу. Акрамя таго, яна павінна ўтрымліваць тэставыя заданні наступных відаў: заданне-выбар, заданне на ўстанаўленне адпаведнасці, заданне на ўпарадкаванне, заданне адкрытай формы, а таксама сістэму падвядзення вынікаў і ацэнкі выканання тэстаў. Усе тэставыя заданні павінны быць прыведзены ў адпаведнасць са структурай і зместам вучэбнай праграмы па дысцыпліне.

Такім чынам, якасці прафесійнай падрыхтоўкі сучаснага спецыяліста немагчыма дасягнуць без адпаведнай сістэмы вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння дысцыпліны. Пры гэтым узровень прафесійнай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў будзе залежаць ад ступені распрацоўкі шэрагу важных аспектаў: 1) сучаснай мэты сістэмы вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння дысцыпліны; 2) сутнаснага азначэння паняцця вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння дысцыпліны; 3) структурных кампанентаў сістэмы вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння дысцыпліны; 4) навукова-абгрунтаванага зместу і метадаў рэалізацыі сістэмы вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння дысцыпліны; 5) механізмаў ацэнкі якасці падрыхтоўкі студэнтаў з выкарыстаннем сістэмы вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння дысцыпліны. Адносна дысцыпліны *«Бібліятэчны фонд»* мы паспрабавалі пакласці пачатак распрацоўцы гэтых аспектаў.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне вывучэння дысцыпліны *«Бібліятэчны фонд»* павінна разглядацца як частка забеспячэння дзейнасці адукацыйнай сістэмы факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па падрыхтоўцы прафесійна кампетэнтных спецыялістаў бібліятэчнай сферы і прымяняцца выкладчыкам для аналізу сітуацый, прыняцця рашэнняў, пабудовы праграмы дзеянняў па іх дасягненні, супастаўлення іх з рэальнымі дзеяннямі і іх карэкцыі.

**Спіс літаратуры**


1. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій пры падрыхтоўцы кадраў для бібліятэк (на прыкладзе выкладання курсаў «Каталагізацыя дакументаў» і «Бібліятэчныя фонды») / Н. А. Ляйко [і інш.] // Навукова-метадычнае і інфармацыйнае суправаджэнне падрыхтоўкі кадраў для сферы культуры і мастацтва: матэрыялы навук.-метад. канф. (Мінск, 3 лют. 2010 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: Р. А. Ровіна (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 108–112.

2. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень = Высшее образование. Первая ступень = Higher education. First degree : ОСРБ 1-23 01 11-2008: спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках): кваліфікацыя – Бібліятэкар-бібліёграф / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2008. – 38 с. – (Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь).

3. Інфармацыйныя рэсурсы. Раздзел 1. Бібліятэчны фонд: тыпавая вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў па спец. 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) / Вучэб.-метад. аб'яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў; уклад.: А. М. Фёдарава, Т. С. Юхнавец. – Мінск, 2011. – 23 с.

4. *Кадырова, Ф. М.* Научно-методическое обеспечение модернизации языковой подготовки в системе непрерывного педагогического образования / Ф. М. Кадырова // Казанский педагогический журнал. – 2008. – № 6. – С. 47–54.

5. Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск: РИВШ, 2011. – 351 с.

6. *Корчагин, Е. А.* Стандартизация профессиональной подготовки специалистов среднего звена и ее регионально-отраслевые особенности / Е. А. Корчагин, И. А. Халиуллина, С. Г. Шуралев // Магистр. – 1997. – Спецвыпуск. – С. 58–64.

7. *Морозова, А. Р.* Педагогическая оценка качества учебно-методического обеспечения образовательных программ для общего среднего образования: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / А. Р. Морозова. – Йошкар-Ола, 2010. – 19 с.

8. Об утверждении Государственной программы развития высшего образования на 2011–2015 годы: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 1 июля 2011 г., № 893 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 79. – С. 15–41.

9. *Речкина, Т. Д.* Учебно-методическое обеспечение самостоятельной деятельности студентов педвуза: автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.08 / Т. Д. Речкина. – Ростов н/Д, 2003. – 20 с.

10. *Фёдорова, А. М.* Организация самостоятельной работы студентов-заочников по курсу «Библиотечный фонд» / А. М. Фёдорова // Удасканаленне дзейнасці кафедраў па прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў на факультэце завочнага навучання: матэрыялы навук.-метад. канф. (Мінск, 2 лют. 2012 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: Ю. П. Бондар (старш.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2012. – С. 261–265.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ